## Урок беларускай мовы ў 6 "Б" класе (наст. Шастак І.Р.), прымеркаваны да дэкады "Энергія і навакольнае асяроддзе", 12.11.2015г.

***Тэма:*** *Складаныя назоўнікі, іх правапіс*

***Мэта:*** Мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні будуць *ведаць:* спосабы ўтварэння складаных назоўнікаў, правілы напісання злучальных галосных; будуць умець: знаходзіць такія назоўнікі ў тэксце, выяўляць іх лексічнае значэнне і сэнсава-граматычную ролю, адрозніваць спосаб асноваскладання і словаскладання, правільна выбіраць злучальную марфему; *спрыяць выхаванню* адказных адносін да праблемы энергазберажэння.

***Абсталяванне:*** дошка, падручнік,даведнік па беларускай мове (6 клас), загадзя падрыхтаваныя ілюстрацыі вучняў.

### Ход урока:

### 1.Арганізацыйны момант

**2.Тлумачэнне новага матэрыялу**: настаўнік аб'яўляе тэму ўрока і прапануе вучням сфармуляваць мэту.

Далей вучні разам з настаўнікам на дошцы запаўняюць табліцу

| ВЕДАЮ | ХАЧУ ВЕДАЦЬ | ДАВЕДАЎСЯ |
|---|---|---|
| Складаныя наз. Складаюцца з некалькіх асноў, частак слоў, слоў, першых літар і гукаў: стагоддзе, васьмідзесяціпяцігоддзе, кінатэатр, універмаг, РБ | Як пішуцца складаныя назоўнікі | Запаўняецца ў канцы ўрока |

Вучні запісваюць ***план работы*** ў сшытак:

1.Правапіс складаных назоўнікаў разам, праз злучок.

2.Правапіс злучальных галосных.

**Слова настаўніка:** як вы ведаеце, учора ў нашай школе адбылося адкрыццё дэкады "Энергія і навакольнае асяроддзе".Для чаго мы абмяркоўваем гэтую тэму? Ці можам мы на нашым уроку сумясціць тэму "Складаныя назоўнікі"з праблемай энергазберажэння?

**Вучні** выказваюцца па гэтых пытаннях і разам з настаўнікам шукаюць у вучнёўскіх адказах складаныя назоўнікі: энергазберажэнне, светадыёд, сантэхніка, тэрмарэгулятар, машына-аўтамат і г.д. Пры гэтым на дошцы прымацоўваюць загадзя падрыхтаваныя малюнкі.

**Настаўнік** просіць пазначыць знакам ? словы, у напісанні якіх сумняваліся. Потым знайсці ў сваіх даведніках адказы. Далей настаўнік дае заданне знайсці ў даведніку адказ на пытанне, *чым адрозніваецца спосаб асноваскладання ад словаскладання.*

**Вучні**: складанне асноў адбываецца пры дапамозе злучальнай галоснай, складанне слоў-без злучальнай марфемы, таму яны пішуцца праз злучок.

**3.Замацаванне:**

выпрацоўка навыку правільнага напісання злучальных галосных праводзіцца на аснове пр.171.

**4.Падагульненне:**

Каменціраванае пісьмо: вучні запісваюць складаныя назоўнікі, пры гэтым агучваюць свой выбар:

электраэнергія, жанчына-ўрач, законапраект, Давыд-Гарадок, паў-Беларусі, жыццялюб, землекарыстанне.

Настаўнік і вучні звяртаюцца да табліцы, работу над якой пачалі ў пачатку ўрока, разам запаўняюць калонку “даведаўся”.

**5.Дамашняе заданне:** у даведніку ст.32-33, пр.172.

**6.Падвядзенне вынікаў ўрока, выстаўленне адзнак**